скарбніца

Францішак
Вядзьмак- Лысагорскі



Малюнак з першага выданьня «Сказу...», Бібліятэчка «Вожыка», 1988 г.

...у мэтах кансьпірацыі я па-ранейшаму
не магу паставіць свой уласнаручны подпіс...

# «...А хто пісаў паэму гэту...»

***Як была напісаная паэма «Сказ пра лысую гару», у якія ўстановы яна дасылалася і як іх кіраўнікі і супрацоўнікі паводзілі сябе пасьля яе атрыманьня***

***Вада камень точыць. Слова ж можа яго раскалоць…***

***Здаецца, такой моцай валодае легендарная паэма «Сказ пра Лысую Гару», якая зьявілася ў застойным 1971 годзе. І вось ужо болей за трыццаць гадоў да гэтага ананімнага фэномену не астывае чытацкая і дасьледчыцкая ўвага. Больш за тое – і ўвага адпаведных «органаў», для якіх (рэдкае выключэньне) «Сказ…» стаў неразгаданай таямніцай.***

***Паэма выйшла па-за рамкі сацрэалізмаўскай літаратуры, стала выклікам і ёй, і савецкаму грамадству. Думаецца, яе выкрывальніцкую сілу ўсьвядомілі не адразу: маўляў, падсьмейваецца адзін пісака з іншых. Самае «крамольнае», што кідалася ў вочы – рэчаісны паказ моўнага стану,***

***Калі ў сталіцы беларускай***
***Культурна сыты мешчанін***

*Лічыў грамадскаю нагрузкай*
*Язык тутэйшым прышчаміць…*

***А вось тое, што падобныя творы расколваюць падмурак дзяржаўнага ладу, адчулі ў нас толькі нядаўна… Зусім ня «творцы» А. ці Б. сатырычна выпісваліся ў «Сказе…», а – шырэй – тая краіна, якая падобных «інжынераў» чалавечых душаў узгадавала, аблашчыла – і ўзнагародзіла чатырма соткамі дачнага дзірвану. Такім вострапафасным творам, у якім з майстэрскай ironіяй выпісвалася б уражлівая карціна духоўнай і маральнай дэградацыі савецка-камуністычнага грамадства, не маглі на пачатку 70-х пахваліцца ні суседнія літаратуры, ні творцы нашай эміграцыі.***

***Дык па чыёй жа галаве сумуе законны і заслужаны лаўровы вянок? Гэтае пытаньне перайшло з паэмай і ў новае стагоддзе. Былі асобныя і калектыўныя дасьледчыцкія публікацыі, а пэўнага адказу не дадзена. Расшуканая «Дзеясловам» своеасаблівая споведзь Франьцішка Ведзьмака-Лысагорскага дапаможа даведацца,*** **калі, як, дзе** ***і*** **з кім** ***пісаўся «Сказ пра Лысую Гару». Па просьбе спавядальніка ягоны псеўданім пакуль што не раскрываецца…***

Задума гэтага твора ўзьнікла выпадкова і зусім нечакана.

Аднойчы сонечным вясновым днём мы з таварышам праводзілі з Каралішчавічаў на аўтобус Сініло-Мінск ягоную жонку і дзіцё. Пакуль малое на хаду лавіла матылёў і разглядала кветкі, ацягваючы на сябе ўвагу маці, мы значна адышліся наперад, гаворачы пра сваё надзённае.

Па баках шырокай лясной прасекі сям-там валяліся скруткі алюмініевага дроту.

— Трэба было б пазьбіраць іх, – сказаў я.

— Навошта яны табе? – зьдзівіўся таварыш.

— Спатрэбяцца на дачы.

— Што ты – абгародзіш імі ўчастак? – насьмешліва запытаў ён. – Дык гэты ж дрот мяккі, з яго будзе ненадзейная агароджа.

— Затое ім можна падвязаць кусты і папрывязваць да калоў маладыя саджанцы.

Таварыш пачаў строіць кепікі наконт таго, як пісьменьнікі будуць на ўчастках растрэсваць гной і ўзводзіць прыбіральні.

Гэта так расьсьмяшыла, што ад нашага рогату, здавалася, задрыжэла лісьцё навакольных асінаў ды бярозаў.

Да таварышавай жонкі, вядома, даносіўся рогат, але яна ня ведала, чым ён выкліканы, бо здалёк ня чула, пра што мы гаварылі.

Нечакана мой суразмоўца схамянуўся:

— Слухай, дык пра гэта можна напісаць гумарыстычную рэч.

— А што ты думаеш? — пагадзіўся я, і мы вырашылі, што абавязкова зварганім што-небудзь.

Пазьней пры сустрэчах мы разы два гаварылі пра гэта, аднак, далей размовы справа ня рухалася.

Але аднойчы таварыш пазваніў мне і сказаў, што нам трэба пабачыцца, бо ёсьць неабходная гаворка.

Пры сустрэчы ён паказаў некалькі строфаў, напісаных ім для эпілогу «Быў час, быў век, была эпоха» і дасьціпнае апісаньне характару аднаго дачніка-пісьменьніка.

— Цяпер, брат, давай працягваць пачатае, – сказаў таварыш.

Так мы пачалі канкрэтна рэалізоўваць тую задуму.

Звычайна зьбіраліся ў яго або ў мяне на кватэры, калі не было нікога з хатніх, і працавалі гадзіны па дзьве-тры ўзапар. Праца ішла лёгка і спорна, пад вясёлы сьмех і гучны рогат. Кожны раз, заканчваючы пісаніну, задаволеныя, мы выпівалі пляшку сухога віна і разыходзіліся.

Разы два, калі ягоныя і мае хатнія былі дома, а нам вельмі рупіла пісаць, мы хадзілі ў галоўны корпус унівэрсітэту, насупраць Дома ўраду, і зачыняліся там у пустой аўдыторыі.

Спачатку таварыш не згаджаўся ісьці ў незнаёмы будынак, але я пераканаў яго, што гэта бясьпечна і ня выкліча ніякай падазронасьці.

У галоўным корпусе разьмяшчаліся факультэты фізікі і матэматыкі, ніхто са студэнтаў і выкладчыкаў ня ведаў нас у твар.

Мы пільна сачылі за тым, што адбывалася на дачным масіве, уважліва прыслухоўваліся да надзённых размоваў дачнікаў.

Нам было зручнаназіраць за ўсім, што адбываецца, з зарослай лесам гары. Відаць, гэтая гара і падказала суседняму з намі дачнаму таварыству афіцыйную назву – «Лысая гара».

А мы гэтую назву ўзялі ў сваю паэму, хаця пісьменьніцкае таварыства называлася «Узгор’е».

Нам амаль нічога ня трэба было выдумваць – як у нарысе, мы сьпісвалі падзеі і характары з натуры.

Скажам, калі Кастусь Цьвірка выдаў зборнік вершаў «Чарназём» і адзін з першых з дапамогаю сваякоў пабудаваў хату, – само гэта напрошвалася ў твор.

Я часта назіраў, як Мікола Арочка пасьпешліва абшываў вагонкаю свой зруб, складзены з абчасаных брусоў, з якіх тады забаранялася будаваць дачы. І вядома ж, ён сядзеў на даху бяз кульбы. Але трэба было неяк завастраць сюжэт, насычаць камічным.

Сьцяпан Александровіч скардзіўся мне, што ў ягоным склепе пад падлогаю праз бетон прасочваецца вада, і ён вымушаны быў абмазаць вадкім шклом сьцены склепу…

Язэп Семяжон наракаў: пахваліў вырашчаныя Александровічавай жонкай (медсястрой па прафесіі) кветкі. Маўляў, хоць ты вазьмі ды ўначы цішком нарэж іх сабе! А тая «адчытала» яго на поўным сур’ёзе: «Я вось вазьму скальпель ды адрэжу ім табе што-небудзь іншае!..»

Само напрошвалася ў паэму тое, як прыбіральню ўгары з бензабакам ад самалёта зрабіў Сілан Гусеў, або як, нібы бамбасховішча, бетаніраваў склеп зяць генерала Мікалая Аляксеева, ці як былы вайсковы пракурор Васіль Хомчанка адхапіў сабе самавольна ўчастак лесу і прылучыў яго да калектыўнага масіву.

Вельмі проста было ў паэме даваць назвы вуліцам і завулкам паводле іх выгляду або разьмяшчэньня, ці таго, што ў іх рабілі лысагорцы.

Часамі мы адводзілі ад сябе ўдар, не жадаючы называць канкрэтных асобаў, якія чым-небудзь сьмешным вылучыліся на ўчастках. Так, адзін паэт прывалок аднекуль бочку гуаны і замкнуў. А мы напісалі: «Адзін празаік меў удачу».

Або пераносілі падзеі, што адбыліся ў Саюзе пісьменьнікаў, на сходы лысагорцаў.

Многія памятаюць, як аднойчы Антон Бялевіч узяў слова на пісьменьніцкім пленуме і, выступаючы на трыбуне, так махнуў рукою, што па інэрцыі «пайшоў вінтом». Мы перанесьлі гэта на сход лысагорцаў.

Або пачулі, як у камандзіроўцы ў Магілёве Эдуард Валасевіч ганяў па

гатэлі з кута ў кут свайго сябра Мікалая Гарулёва, – і таксама апісалі гэта. (Дарэчы, зьдзіўлены Іван Шамякін, які ўзначальваў тую пісьменьніцкую брыгаду ў Магілёў, абураўся тады: хто ж гэта пабочны мог ведаць і трапна апісаць па сьвежых сьлядах такое здарэньне?)

Я бачыў, як дырэктар выдавецтва Захар Матузаў сам майстраваў сабе дачу, а непадалёк ягонаму падначаленаму, рэдактару выдавецтва Хведару Жычку, дапамагалі складаць хату Алесь Ставер і Хведар Чэрня з бацькам.

…Паэма была напісаная за сем ці восем прысестаў.

Па меры напісаньня, акрамя чарнавіка, што захоўваўся ў мяне, таварыш начыста пераносіў сабе ў блакнот закончаныя разьдзелы.

Пазьней мы з ім пайшлі ў камісійны магазін па вуліцы Карла Маркса, непадалёк ад кнігарні, і купілі за 120 рублёў новую машынку. Калі вярталіся з ёй, нечакана сутыкнуліся твар у твар з Міколам Ткачовым. Павіталіся, але, зьбянтэжаныя, што «выдадзім» сябе, нават не спыніліся.

— От, халера, і трэба ж гэтак апраставалосіцца!.. – бедаваў таварыш. – Можна сказаць, што з палічным папаліся, – і пацікавіўся, дзе знаходзіцца дача Ткачова, які быў тады адказным сакратаром Саюза пісьменьнікаў.

Я супакоіў: Мікола Ткачоў узяў сабе ўчастак не на пісьменьніцкім, а на выдавецкім «масіве».

Адразу ж зарыфмавалі:

Паколькі проза не даецца,
Дык сакратар СП Ткачоў
Уцёк на ўчастак выдавецтва,
Сказаўшы: – Прэч ад стукачоў!

Праўда, потым пабаяліся, што надта разззлуем ахоўнікаў парадку – і «стукачоў» замянілі «смаркачамі», хоць ведалі, што «смаркачы» тут зусім недарэчы.

Калі былі напісаныя першыя чатыры разьдзелы і эпілог без 22-х апошніх радкоў, якія зьявіліся пазьней, мы надумалі даслаць гэта ўсё ў некаторыя ўстановы. Вырашылі, што варта «накіраваць» напісанае кансультантам Саюзу пісьменьнікаў, выдавецтву «Мастацкая літаратура», Інстытуту літаратуры Акадэміі навук і рэдакцыям «Полымя», «Маладосьці» і «ЛіМа».

Я купіў у аптэцы медыцынскія пальчаткі, у магазіне – пачак танюсенькай паперы, на пошце – велікаватых канвертаў і, калі нікога з маіх хатніх не было дома, аддрукаваў шэсьць экзэмпляраў першых чатырох разьдзелаў паэмы з эпілогамі – апусьціў канверты з паэмаю ў скрынку на Галоўпаштамце. А праз дзень, ведаючы адрасантаў, пачаў незаўважна сачыць, як іх кіраўнікі і супрацоўнікі будуць рэагаваць на падкінутую «бомбачку». І прасачыў амаль усюды – што там адбываецца… Толькі не наведаў Інстытут літаратуры Акадэміі навук. У яго я амаль не хадзіў, таму баяўся паказвацца і на гэты раз: каб не наклікаць на сябе бяды. (Казалі, што і там актыўна перадрукоўвалі і распаўсюджвалі атрыманыя імі экзэмпляры твору).

Кіраўнікі і супрацоўнікі ўстаноў, у якія былі дасланы першыя разьдзелы, па-рознаму, часам дзіўна і сьмешнавата, паводзілі сябе, атрымаўшы паэму.

Чутка пра яе зьяўленьне хутка распаўсюдзілася з «Маладосьці», у якую заходзіла мноста народу – мастакоў і пісьменьнікаў.

Галоўны рэдактар часопісу Алесь Асіпенка, які заўсёды праглядаў усю рэдакцыйную пошту і асабліва любіў чытаць паэзію, першы выявіў «Сказ…». У ягоным кабінеце ўпершыню калектыўна чыталі паэму. Супрацоўнікі рэдакцыі са сьмеху надрывалі жываты.

Праз пару гадзінаў у «Маладосьць» прыйшлі Янка Брыль і Іван Мележ. У кабінеце адказнага сакратара рэдакцыі Уладзіміра Юрэвіча пачалося другое калектыўнае чытаньне – з гэтакім жа, як і раней, рогатам.

Кансультанты Саюзу пісьменьнікаў адразу ж цішком перадрукавалі паэму ў некалькіх экземплярах і распаўсюдзілі – сябрам і знаёмым.

Сьмешнавата атрымалася ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Там паэма аказалася перадрукаванаю ў многіх экземплярах на машынцы ЦК КПБ. Дарэчы, адзін з гэтых экземпляраў сябры ўручылі і мне.

Даведаўшыся пра зьўленьне такога твору, Іван Чыгрынаў, які працаваў тады ў «Полымі», некалькі дзён узапар раней часу прыходзіў у рэдакцыю, каб першым атрымаць паэму. Але яго апярэдзіў рэдактар Алесь Бачыла, які перахапіў «Сказ…» і ўпотай перадрукаваў і раздаў яго надзейным сябрам.

У «ЛіМе» паэма трапіла ў рукі рэдактара газета Леаніды Прокшы. У прысутнасьці свайго намесьніка ён папрасіў загадчыка адзьдзела літаратуры Анатоля Грачанікава ўслых прачытаць усе разьдзелы, а потым, без усялякага сьмеху, на поўным сур'ёзе аднёс у Камітэт дзяржаўнай бясьпекі.

Неўзабаве некаторыя экземпляры паэмы (з тых, што я адаслаў у названыя ўстановы) апынуліся ў ЦК КПБ.

«Маладосьцеўскі» экземпляр яшчэ некалькі дзён захоўваўся ў кішэні Алеся Асіпенкі. У тэатральным скверы, насупраць Дома афіцэраў, пры шматлюдным зборышчы Асіпенка правёў яшчэ адно калектыўнае чытаньне, на якім аказаўся хтосьці з работнікаў ЦК КБП. Асіпенку пазванілі «адтуль» і загадалі прынесьці твор. Разгублены, Алесь Харытонавіч схлусіў, што паэма ў яго дома. З ЦК КПБ прыслалі службовую машыну, зьезьдзілі да яго дахаты і забралі «маладосьцеўскі» экземпляр.

Усё гэта адбылося за тыдзень ці два да чарговага зьезду пісьменьнікаў Беларусі.

У першым перапынку на зьезьдзе Алесь Звонак, Анатоль Астрэйка і Рыгор Няхай літаральна прыціснулі мяне да сьцяны і на поўным сур'ёзе заявілі, што гэта я напісаў «Сказ…».

Прызнацца, я не чакаў такога павароту справы. Аднак, хоць і зьбянтэжыўся, імгненна знайшоў, што адказаць:

— Разумнікі!.. Мне не было чым займацца, пакуль вы пілі на дачах, дык я вырашыў пацешыць вас!.. Колькі часу трэба было пісаць такую рэч?.. Пакуль вы зараблялі на хлеб вершамі, дык я задарма, без ганарару, пацяшаў бы вас і сьмяшыў…

Мая контратака канчаткова абяззброіла іх, і названая «тройка» пасьля ўжо ніколі не напамінала мне пра тую гаворку.

На зьезьдзе хадзілі чуткі, што ў прэзідыум была пададзеная запіска пра паэму, але там разгубіліся і прамаўчалі.

Аказалася, што некаторыя пакрыўджаныя паэмаю западозрылі ў яе аўтарстве Анатоля Вялюгіна і ўначы адчытвалі і лаялі яго па тэлефоне. А ён, бядак, не знайшоў нічога лепшага, як на ўрадавым прыёме пасьля зьезду, пад чаркаю, услых у прысутнасьці многіх пачаць вінавата апраўдвацца перад сваім земляком Машэравым:

— Пятро Міронавіч, я ня маю адносінаў да напісаньня гэтай рэчы.

На што той, сьмеючыся, уголас адказаў:

— А ты, Анатоль, дарэмна адмаўляешся. Нам з Кісялёвым, наадварот, «Сказ пра Лысую гару» вельмі спадабаўся.

Пасьля распаўсюджваньня першых разьдзелаў паэмы па рэдакцыях пачалі хадзіць незнаёмыя людзі, пільна прыглядаючыся да шрыфтоў машынак і некаторых рэдакцыйных рукапісаў у архіве.

Але ў хуткім часе зьявіліся падробкі пад паэму, як паасобнымі строфамі, так і цэлымі разьдзеламі. У прыватнасьці, быў распаўсюджаны крытычны машынапісны тэкст пра жыцьцё і працу Міністэрства культуры, напісаны дабротна і хлёстка. Я не сумняюся, што яго напісаў Пятрусь Макаль, які ў свой час працаваў у гэтай установе.

Працягваючы далейшую працу над паэмаю, мы вымушаны былі напісаць «Прадмову да другога, дапоўненага выданьня», у якой урачыста заявілі, што ня маем ніякіх адносінаў да гэтых падробак.

Разам з трыма ці чатырма наступнымі разьдзеламі я даслаў чарговую рату твора зноў у тыя ж самыя ўстановы.

Аднак такога моцнага ўражаньня, як пры зьяўленьні першых разьдзелаў, яна ўжо не зрабіла на чытачоў, хаця некаторых таксама заінтрыгавала.

<…>

А тым часам зьявіліся новыя падробкі і асабліва агідны і абразьлівы разьдзел з брыдкімі словамі пра нашых цудоўных пісьменьнікаў і добрых людзей.

Мы былі вымушаныя даць суровую водпаведзь аўтару гэтага пасквіля сваім «Апошнім папярэджаньнем», разам з якім я адаслаў у тыя ж установы заключныя разьдзелы паэмы і наш разьвітальны ліст да яе чытачоў.

Дарэчы, гэтыя разьдзелы таксама не зрабілі сенсацыі, хаця, па-мойму, заключны разьдзел – «Вялікі рух» – і эпілог – найбольш удалыя мясьціны з усяе паэмы.

Між іншым, калі я паспрабаваў ганіць гэты разьдзел Васілю Быкаву, дык той катэгарычна і безапеляцыйна назваў яго геніяльным.

Асабіста ў мяне склалася такое ўражаньне, што многія наогул не чыталі апошніх разьдзелаў паэмы.

Шчыра кажучы, мы не зьбіраліся заканчваць твор, нават пасьля трохі шкадавалі, што назаўсёды разьвіталіся з ягонымі чытачамі і не апісалі таго, як лысагорцы выломвалі рамы і дзьверы ў старым будынку Саюзу пісьменьнікаў, дзе ў грамадзянскую вайну разьмяшаўся штаб Сердзіча, а ў Вялікую Айчынную быў забіты гаўляйтэр Кубэ. І цягнулі з яго на дачы карціны і дываны; як потым усяліліся ў новае памяшканьне Дома літаратара, павялічыўшы ягоны штат да фантастычных памераў, панабраўшы ў яго нейкіх падазроных і «дзіўных» асобаў.

Завяршыць паэму прымусіў выпадак, які ўразіў і трохі напалохаў нас.

Адбыўся ён у часе адной з паездак, у якой з групай пісьменьнікаў, кампазітараў і мастакоў быў Пятро Міронавіч Машэраў.

Вярталіся мы тады з Нарачы і на шляху паабедалі ў рэстаране ні то ў Плешчаніцах, ні то ў Бягомлі.

Я сеў у другі аўтобус, у якім быў сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін. Як толькі аўтобус крануўся з месца, хтосьці ў вясёлым настроі ўслых прадэкламаваў на памяць нейкія радкі з паэмы «Сказ пра Лысую гару».

Кузьмін адразу ж ажывіўся, устаў з месца і, трымаючыся рукамі за поручні пад стольлю, уголас абвясьціў:

— Ну от давайце, нарэшце, супольна вырашым гэтую справу. Калі вы лічыце, што паэму «Сказ пра Лысую гару» варта друкаваць, мы надрукуем яе.

— Падонкі! – закрычала большасьць у аўтобусе.

— Надрукаваць! – рагаталі астатнія.

— Ну, от бачыце? Вы самі ня можаце прыйсьці да адзінага рашэньня, –

падагульніў разгублены Аляксандр Трыфанавіч. – А як жа быць нам?.. – і загадным тонам дадаў: – Канчайце з гэтай справаю, бо нам ужо надакучыла гэта!

Адбывалася такая гаворка яшчэ да таго, як мы напісалі заключныя разьдзелы паэмы.

Мы абодва задумаліся над непрадбачнымі вынікамі, што могуць узьнікнуць у далейшым, і вырашылі заканчваць паэму, што і зрабілі ў хуткім часе.

Пазьней таварыш аддаў мне 60 рублёў і забраў сабе машынку, якую мы набылі разам.

Прызнацца, я так прывык да яе, што мне не хацелася разлучацца з ёю, і я напасьледак аддрукаваў на ёй разьвітальны ліст да яе, які дзесьці захоўваецца сярод маіх папераў.

Раней хтосьці з маіх хатніх выявіў машынку, якую я хаваў пад стольлю ў кладоўцы. Калі мае спыталі, што гэта за машынка ляжыць там, я трохі спалохаўся, але схлусіў, што адзін са знаёмых з раёна папрасіў мяне здаць яе ў рамонт.

Мы, вядома, баяліся, што, калі даведаюцца пра наша аўтарства, нам давядзецца несьці суровую адказнасьць. Таму, каб трохі засьцерагчы сябе, скіравалі асноўную крытыку супраць мяшчанства, нават пяючы дыфірамбы партыі, якая быццам стаіць на варце беларускай мовы.

Хто ўважліва чытаў паэму, той, вядома, зразумеў і адчуў усё гэта, бо яно, як кажуць, шыта белымі ніткамі, як бы мы ні стараліся ва ўгоду чыноўнікам і бюракратам выгарадзіць сябе.

Мы разумелі, што ахоўнікі дзяржаўнага ладу ў сувязі з пашырэньнем у краіне самвыдату «трымаюць вуха востра» і захочуць устанавіць, хто займаецца такой пісанінаю.

Дый, шчыра кажучы, не хацелася, каб пакрыўджаныя ў паэме калегі помсьцілі нам. Бо часамі было дзіўна, як некаторыя з іх не разумелі жартаў і кепікаў і ўсур'ёз прымалі ўсё на свой адрас.

Так, аднойчы Мікола Хведаровіч, Алесь Кучар і я прыехалі на сустрэчу са студэнтамі і выкладчыкамі Навапольскага сельгастэхнікума. Да пачатку выступленьня мелі шмат вольнага часу і, шпацыруючы па маляўнічым навакольлі, успомнілі пра паэму.

— Падонкі! – адразу ж не вытрымаў Мікола Хведаровіч.

— Чаму? – зьдзівіўся Алесь Кучар. – Хіба ж у ёй зьняважылі цябе? А я, напрыклад, разумею жарты і не злуюся.

Алесь Ставер, дык той, наадварот, выхваляўся ўсім, што ён часта ўпамінаецца ў паэме – адпаведна сваёй вазе ў літаратуры. А вось пра ягоных таварышаў Юрася Сьвірку і Уладзіміра Паўлава ў ёй няма ні слова. Значыць, яны не заслугоўваюць таго, каб пра іх пісалі.

Дарэчы, тады Алесь Кучар прызнаўся, што ён толькі аднаму Артуру Вольскаму расказваў пра тое, як браў у цырку гной. У далейшым я скарыстаў гэта, жадаючы адвесьці некаторых на ілжывыя сьляды…

Сёй-той, мабыць, помніць, як я любіў азартна выказваць пра гэта вае меркаваньні. Спачатку казаў, што я западозрыў у аўтарстве паэмы Кандрата Крапіву, але пазьней усумніўся, бо ён ня ведае многіх маладых, хто фігуруе ў творы. Пасьля накіраваў падазронасьць на Анатоля Вялюгіна. Пазьней даказваў, што паэму напісаў усё-такі Анатоль Астрэйка, які меў вопыт працы над гумарыстычным дзедам-Міхедам. Тым больш, што ён таксама мае на пісьменьніцкім участку дачу і бачыў, што там робіцца.

Нарэшце, пачуўшы ад Алеся Кучара ягонае прызнаньне, я скіраваў

ілжывы сьлед на Петруся Макаля. Маўляў, яны тады сябравалі з Артурам Вольскім, які таксама ўзяў сабе ўчастак, – і абодва зварганілі паэму. Тым больш, што напісана яна ў класічным стылі, з дакладнымі рыфмамі, якія любіць Пятрусь Макаль ужываць у ваіх вершах. З гэтым маім кіўком у ягоны бок зьмірыліся многія.

Помню, як Максім Танк, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Пятрусь Макаль і я выступалі на літаратурным вечары і хтосьці са слухачоў падаў запіску, у якой пытаўся, хто аўтар паэмы «Сказ пра лысую гару».

Максім Танк незаўважна падміргнуў мне і зрабіў непрыкметны ківок у бок Петруся Макаля, які ад сьмеху пачырванеў. (Прызнацца, я сам не ў захапленьні ад гэтага твору. Праўда, заўважыў толькі, што пры калектыўным чытаньні яе яна і ў мяне выклікала азартны рогат).

Мяне зьдзіўляла, што такі еўрапейскі паэт, як Максім Танк, надзвычай высокай думкі пра паэму «Сказ пра Лысую гару». Памятаю, як у камандзіроўцы мы жылі з ім у адным нумары гасьцініцы і ён увечары на поўным сур'ёзе даказваў мне пра значэньне «Сказу…» ў нашай літаратуры. Я насуперак ягоным доказам, сьмеючыся, не пагаджаўся.

Мне было пацешна, калі нават такія майстры слова, як Янка Брыль або Васіль Быкаў ці Іван Мележ не маглі распазнаць, хто напісаў «Сказ пра Лысую гару», падазраючы ў яе аўтарства тых, чый стыль, лексіка і манера пісьма зусім іншыя.

Памятаецца, як адразу ж пасьля другога калектыўнага чытаньня паэмы ў «Маладосьці» Янка Брыль сказаў уголас, што «жыўцом» адчувае аўтараў. Калі я спытаўся, менавіта каго ён падазрае, Янка, не задумваючыся, адказаў:

— Барадуліна з Караткевічам.

Мяне гэта зьдзівіла, бо ў паэме няма ніводнай барадулінскай рыфмы, ніводнага ягонага словаўтварэньня.

Васіль Быкаў, дзелячыся са мной уражаньнем ад першых разьдзелаў паэмы, выказаў здагадку, што яе напісаў Алесь Наўроцкі, – што таксама вельмі зьдзівіла мяне. У паэтычнай творчасьці Алеся Наўроцкага амаль адсутнічае гумар, дый стылістыка яго вялая і каструбаватая.

Некалькі разоў пра аўтарства паэмы пачынаў гаварыць са мной Іван Мележ. Але сам ён не выказваў ніякіх здагадак наконт аўтара гэтай рэчы. Аднойчы я з новымі, яшчэ не надрукаванымі на машынцы разьдзеламі паэмы ў кішэні, сядзеў у ягоным кабінеце на вуліцы Янкі Купалы, і Іван раптам ні з таго ні з сяго запытаўся, каго я лічу аўтарам «Сказа пра Лусую гару». Я трошкі зьбянтэжыўся і няпэўна адказаў, што яе мог напісаць Анатоль Вялюгін.

— О, не! – катэгарычна запярэчыў Іван. – Паэма напісана з прагрэсіўных пазіцыяў, а Вялюгін – рэакцыянер.

Я так і не разумею сэнсу гэтага сьцьвярджэньня. Чаму паэма напісана з прагрэсіўных пазіцыяў? І чаму Вялюгін – рэакцыянер?

— Ну, дык не падазраеш жа ты, што я напісаў яе? – сьмеючыся, запытаўся я.

— Хто цябе ведае? – таксама ўсьміхаючыся і гледзячы мне ў вочы, сказаў ён.

— Я ж не аматар гумару, – паспрабаваў ухіліцца я.

— Вось толькі гэта і не дае мне падставы западозрыць цябе ў аўтарстве, – адказваў ён разгублена.

Нават такі цікавы пісьменьнік і крытык, як Алесь Адамовіч, – і той аднойчы пытаўся ў мяне, хто б мог напісаць гэты твор?

— Чорт яго ведае, – адказваў я…

Я часта ўспамінаю, як Рыгор Семашкевіч, рады, што нарэшце-такі перапісаў, раздабыўшы, паэму, казаў мне:

— Сёньня я нарэшце перапісаў яе.

Сьмеючыся ў душы з усяго гэтага, я аднойчы пажартаваў Сьцяпану Александровічу:

— Доктарскую абараняць табе ўжо ня трэба. Узяў бы ды заняўся карыснай справаю – і па стылі і слоўнікавым запасе ўстанавіў, нарэшце, аўтара «Сказа пр Лысую гару».

...Два апошнія разы я апускаў канверты з разьдзеламі паэмы ўжо не на Галоўпаштамце, а ў гарадскіх адзьдзяленьнях сувязі па месцах знаходжаньня установаў, у якія адсылаў твор.

<...>

Пасьля сьмерці Івана Мележа і Аркадзя Куляшова я шкадаваў, што ў размовах з імі пра паэму не прызнаўся ў сваім аўтарстве. Але пазьней, асьмялелы, я сказаў пра гэта блізкім людзям. А тым, каго асабліва паважаў, нават уручыў першы экземпляр паэмы, перадрукаваны на ўласнай машынцы. І вельмі ўдзячны ім за тое, што яны зьберaглі маю таямніцу.

Я не называю прозьвішча таварыша, разам з якім мы напісалі паэму. Гэта пры жаданьні ён заўсёды можа зрабіць сам, бо ў яго захоўваецца чыставы рукапіс твору ў блакноце, зробленым з нейкага зеленаватага агульнага сшытка, а таксама машынка, якой я надрукаваў на танюсенькай паперы шэсьць экземпляраў «Сказу пра Лысую гару», якія адсылаў у некаторыя ўстановы.

Акрамя таго, у таварыша ёсьць яшчэ два экземпляры паэмы, перадрукаваныя на машынцы і пераплеценыя самаробна ў вокладкі з агульных сшыткаў. Першы экземпляр такога сшытка з вокладкаю нейкага невыразнага сьветлаватага колеру. А другі экземпляр – у вокладцы сьветла-вішнёвага колеру, зробленай «пад скуру кракадзіла».

Дарэчы, з гэтага другога экземпляра я перадрукоўваў для «Вожыка» поўны тэкст у канчатковай аўтарскай рэдакцыі, завешчаны як кананічны для магчымай у будучым публікацыі.

Перадрукоўваў я для «Вожыка» апошні канчатковы варыянт паэмы, калі нам стала вядома, што там зьбіраюцца зноў выдаваць яе ў сваёй бібліятэчцы. Па пошце я адаслаў гэты варыянт як старажоўскую знаходку пры зносе старога дома ад імя Вінцуся Абабуркі. На вялікі жаль, «Вожык» не пасьпеў выкарыстаць гэты варыянт, бо тыраж быў ужо цалкам аддрукаваны.

А шкада, што так атрымалася, бо мы дапрацоўвалі твор, скарачалі ў ім лішнія страфы, зрабілі некаторыя ўстаўкі і кампазіцыйныя перастаноўкі.

Гэты варыянт паэмы захоўваецца ў нас абоіх, і менавіта ён передрукаваны ў вышэйназваных агульных сшытках.

У заключэньне яшчэ раскажу пра тое, якая трагікамічная эпапея з паэмаю пачалася ў гады перабудовы, пасьля таго, як рэдакцыя часопісу «Вожык» у сваёй бібліятэчцы асобнай кніжыцаю выдала некаторыя разьдзелы з гэтага твора ўпершыню.

«Вожыкаўскае» выданьне, вядома, і абрадавала і засмуціла нас. Абрадавала та-му, што хоць частка паэмы, нарэшце, надрукавана. Пра яе пачалі зьяўляцца выказваньні ў рэспублікнскім і ўсесаюзным друку. А засмуціла таму, што на кніжыцы не названае імя аўтара: яно адвольна зробленае з першай паловы ягонага прозьвішча. І яшчэ нідзе не было сказана, што друкуецца толькі частка паэмы, некаторыя разьдзелы з яе.

Дарэчы, выдадзена ў Бібліятэчцы «Вожыка» было менавіта тое, што я ў свой час упершыню дасылаў у вышэйназваныя ўстановы.

Таму мы вымушаныя былі зьвярнуцца з адкрытым лістом да «Вожыка»,

які хацелі надрукаваць у «ЛіМе». Але рэдактар газеты Анатоль Вярцінскі чамусьці пабаяўся надрукаваць наш ліст. У ім мы паведамлялі, што ў рукапісах шырока распаўсюджаныя шматлікія падробкі пад паэму, дакладна пералічвалі назвы ўсіх яе разьдзелаў і прасілі перавесьці ганарар за гэты твор на рахунак, што адкрыты ў рэспубліканскім банку на будаўніцтва помніка вялікаму сыну беларускага народа, рэвалюцыянеру-дэмакрату Кастусю Каліноўскаму.

Пазьней з гэтакай жа просьбай мы зьвярталіся таксама да начальніка Беларускага аддзяленьня ўсесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах, да Прэзідыуму Саюзу пісьменьнікаў Беларусі і асабіста да некаторых нашых вядомых пісьменьнікаў.

Максім Танк хадзіў з нашым лістом у ЦК КПБ, дзе яму нічога пэўнага не сказалі, а паабяцалі, што перададуць ліст у выдавецтва, якое, магчыма, надрукуе паэму.

Другія экземпляры ўсіх гэтых лістоў захоўваюцца ў мяне як унікальныя дакументы тае перапіскі.

*18. 08. 1991 г.*

*Менск.* *Францішак Вядзьмак-Лысагорскі.*

*P. S.* Вышэйназваныя лісты ў «Вожык», Прэзідыуму Саюза пісьменьнікаў Беларусі, асабіста некаторым яго членам і начальніку Беларускага аддзяленьня ўсесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах я дасылаў ня з Менску: браў напракат машынкі, аддрукоўваў гэтыя матэрыялы і клаў у канверт.

Вышэй я адзначыў таксама, што пазьней асьмеліўся і прызнаўся некаторым сябрам і блізкім, што маю дачыненьне да аўтарства «Сказу пра Лысую гару». Праўда, не называў ім прозьвішча свайго таварыша-суаўтара і наогул нічога не гаварыў аб ім, бо баяўся за ягоны лёс. Мне было ўжо ўсё роўна, а ўмешваць яго ў гэтую справу я пабойваўся.

Аб сваім дачыненьні да аўтарства «Сказу пра Лысую гару» я прызнаўся ў першую чаргу Пімену Панчанку і Максіму Танку. Максім Танк расказваў мне, што, калі ён панёс у ЦК партыі «Сказ пра Лысую гару» і прапанаваў надрукаваць яго, там спыталіся, ці ведае ён, хто напісаў гэты твор. Максім даказаў, што ведае, але ня можа сказаць, бо аўтар прызнаўся аб гэтым яму па сакрэце.

Перад самай сьмерцю Максім Танк прызнаўся пра маё дачыненьне да аўтарства «Сказа пра Лысую гару» сваім землякам-літаратарам, разам з якімі езьдзіў на Радзіму.

На пахаваньні паэта, каля яго труны, адзін з іх сказаў мне пра гэта…

Пазьнейшыя мае розыгрышы наконт аўтарства паэмы прывялі да таго, што я сам ледзь не заблытаўся ва ўсёй гэтай справе.

Супрацоўнікі «Крыніцы» аднойчы сказалі мне, што маё аўтарства «вылічыў» Георгій Колас, але не захацеў пісаць пра гэта ў сваёй публікацыі ў іх.

У перапынку на нейкім пісьменьніцкім зборышчы ў Доме літаратара, калі мы, адасобіўшыся, сядзелі з Янкам Брылём, да нас падышоў галоўны рэдактар «Крыніцы» Уладзімір Някляеў і сказаў:

— N. N., ідзіце да нас у рэдакцыю і атрымайце ганарар.

— За што? – зьдзівіўся я.

— За паэму «Сказ пра Лысую гару», – адказаў рэдактар.

— А лепшага ты нічога не прыдумаў? – таямніча запытаўся ў яго Янка Брыль.

— Хіба ж я даваў вам гэтую паэму?.. Я ня ведаю, дзе вы ўзялі яе, – адказаў я.

Гэты адказ, мабыць, канчаткова зьбянтэжыў супрацоўнікаў «Крыніцы». Яны, напэўна, вырашылі, што я проста разыграў іх. Бо паэмы я сапраўды не даваў ім. У мяне было два экземпляры яе кананічнага тэксту. Адзін з іх я ўзяў і прывязаў за ручку дзьвярэй іхняй рэдакцыі. А гэтага ніхто ня бачыў.

*1999 год.* *Францішак Вядзьмак-Лысагорскі*

*P. P. S.* Гэтыя ўспаміны я прапаноўваю ў друк са скарачэньнямі, якія, на жаль, познасьцю не магу пакуль што абнародаваць. Да іх дадаю таксама копію майго ліста ў Прэзідыум Саюзу пісьменьнікаў. У свой час ён быў надрукаваны на машынцы, якую я браў напракат у адным з пісьменьніцкіх дамоў творчасьці былога Савецкага Саюзу.

*Францішак Вядзьмак-Лысагорскі*
*Красавік 2003 году.*

**Дадатак**

*Прэзідыуму Саюзу пісьменьнікаў Беларусі*
*ад Францішка Ведзьмака-Лысагорскага.*
*Копіі: Беларускаму аддзяленьню*
*ўсесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах*
*і некаторым членам Прэзідыуму.*

Паважаныя члены Прэзідыума!

У пачатку мінулага году «Вожык» выдаў у сваёй бібліятэчцы асобнай кніжыцаю некаторыя разьдзелы з маёй паэмы «Сказ пра Лысую гару», нават не спасылаючыся на тое, што друкуе ў скарочаным варыянце. Таму ўвосень мінулага года я праз газету «Літаратура і мастацтва» зьвяртаўся да яго з адкрытым лістом, у якім паведамляў, куды перавесьці мой ганарар, а таксама выказваў свае прэтэнзіі да часопісу.

На жаль, рэдактар «ЛіМа», на імя якога я дасылаў ліст, чамусьці не надрукаваў яго, што мяне надзвычай зьдзівіла і ўразіла.

Няўжо ён палічыў мой ліст жартам?

«Хороши шутки, когда!..»

Вядома, крыўдна, калі ў агульным поступе наперад, на ходу ў страі не адчуваеш побач локця і пляча калегі.

Разгублены, я доўга вагаўся, што мне рабіць? Падаваць у суд на часопіс або газету? Але ў пару галоснасьці гэта выглядала б сумна дый прыкра. Таму я рашыў папрасіць Вас паўплываць на сваё выданьне і абавязаць газету ўсё-ткі надрукаваць мой ліст, паколькі, як Вы зразумееце, гэта мае немалаважнае значэньне для мяне.

Чаму?

Па-першае, таму, што сярод чытачоў распаўсюджаныя падробкі пад паэму, у прыватнасьці, пахабная, з брыдкімі словамі частка і яшчэ адзін разьдзел, якіх я наогул не пісаў і да якіх ня маю ніякіх адносінаў. Пра што ў свой час заяўляў ва «Уступе да другога, дапоўненага выданьня» паэмы і ўапошнім папярэджаньні.

Па-другое, у «Сказе пра Лысую гару» 1537 радкоў, а ў кніжыцы «Вожыка» надрукавана толькі 795 радкоў.

Між тым у маім разьвітальным лісьце да чытачоў, якім заканчваецца паэма, сказана, што яна складаецца з разьдзелаў: «Уступ да другога, дапоўненага выданьня. Апошняе папярэджаньне. 1. Дзяльба. 2. Праблема.

3. Будаўніцтва. 4. Так і зажылі. 5. Мужчынскі страх. 6. Пудзілы. 7. Вялікі рух. Замест эпілогу».

Паколькі вожыкаўскае выданьне некаторых разьдзелаў паэмы стала літаратурным фактам і зьявіліся выказваньні пра яе ў рэспубліканскім і ва ўсесаюзным друку, ня сёньня дык заўтра непазьбежна ўзьнікне пытаньне аб выданьні гэтага твору.

А па якім экземпляры выдаваць яго?

Вядома ж, не па скарочаным, што выйшаў у бібліятэчцы «Вожыка», а па сапраўдным арыгінале з маім разьвітальным лістом да чытачоў.

Нарэшце, мне як аўтару, не ўсё роўна, куды пераведзены ганарар за мой твор. Я хачу, каб ён быў пераведзены на рахунак, што адкрыты ў дзяржбанку БССР на пабудову помніка вялікаму сыну беларускага народа, рэвалюцыянеру-дэмакрату Кастусю Каліноўскаму.

Дый, у рэшце рэшт, ёсьць жа ў мяне і чалавечая годнасьць!

У тым жа разьвітальным лісьце да чытачоў чорным па белым напісана, што маё імя і прозьвішча: Францішак Вядзьмак-Лысагорскі.

А «Вожык» у сваім выданьні зусім апусьціў май імя, адвольна ўтварыўшы яго з першай паловы майго прозьвішча.

Разам з гэтай заяваю дасылаю Вам свой ліст «Вожыку» і прашу перадаць яго ў газету «Літаратура і мастацтва» для друку.

З глыбокай павагаю да Вас

*Францішак Вядзьмак-Лысагорскі.*

*P. S.* Паколькі ў мэтах кансьпірацыі я па-ранейшаму не магу паставіць свой уласнаручны подпіс, прашу лічыць ім шрыфт гэтай машынкі і другі экземпляр заявы Прэзідыуму Саюза пісьменьнікаў БССР, а таксама заявы Беларускаму аддзяленьню ўсесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах і адкрытага ліста «Вожыку», якія замест дакументаў, на выпадак узбуджэньня судовай справы па ўсіх выдавецкіх і ганарарных пытаньнях, што могуць узьнікнуць у далейшым, здаю на захаваньне ў сейф ламбарду.

*Францішак Вядзьмак-Лысагорскі.*
*8 красавіка 1989 году.*

## Ад рэдакцыі «Дзеяслова»:

***Гэтыя запісы мы атрымалі пад подпісам: «Франьцішак Вядзьмак-Лысагорскі». Аднак, пазнаёміўшыся з тэкстам, прыйшлі да высновы, што чалавек, які называе сябе адным з аўтараў «Сказу...», і шчыра піша пра тое, як паэма пісалася ягоным таварышам, а ён пры гэтым прысутнічаў, даючы парады і падказваючы сюжэты, ня мае поўнага права адзін падпісвацца гэтым імем. Рэдакцыя «Дзеяслова» зьвярнулася да «таварыша», пра якога згадвае аўтар запісаў, і ён паабяцаў у адзін з бліжэйшых нумароў часопіса даць свае нататкі пра тое, як пісалася паэма, паказаць чарнавікі, першыя аддрукаваныя асобнікі і нават знакамітую «пішучую машынку». І, што важна, запісы ён дасьць пад сваім сапраўдным імем...***

***А таму – чытайце «Дзеяслоў» і вы першымі даведаецеся разгадку самай вялікай беларускай літаратурнай таямніцы XX-га стагоддзя!***